# З шэрагу паэтаў-адраджэнцаў

У адраджэньні кожнага народа, асабліва ва ўздыме ягонай нацыянальнай сьведамасьці, заўсёды вялікую ролю адыгрывалі паэты і пісьменьнікі. З выключнай сілай гэта выявілася ў эпоху рамантызму, калі літаратары «зьвярнуліся тварам да народа» . Гэтак у Нямеччыне адраджэнцамі былі Іяган Гётэ і Фрыдрых Шылер, у Англіі — Джордж Байран, у Расіі — Аляксандр Пушкін і Міхаіл Лермантаў, у Польшчы — Адам Міцкевіч, а ў Беларусі — Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Ян Чачот, Францішак Багушэвіч і г.д.

Сёньня ў Беларусі працуе шмат выдатных паэтаў і пісьменьнікаў, якія самааддана у сучасных, няпростых умовах праводзяць адраджэньне. Сярод іх знаходзіцца і аўтар кнігі «Дол» Сяргей Законьнікаў, лаўрэат многіх айчынных і міжнародных літаратурных прэмій.

Ягоная паэма «Per aspera ad astra», якая ўвайшла ў новую кнігу, мае асаблівае значэньне і вартасьці. Яна добра адлюстроўвае ў апісаным жыцьці аднае асобы, у пэўным гістарычным часе, лёс усяго беларускага народа. Згодна думак, выказаных філязофам Мікалаем Бярдзяевым, жыцьцё аднэй асобы — гэта мікракосмас народа. Я бязьмежна ўдзячны аўтару гэтай кнігі за ўключэньне ў яе паэмы «Per aspera ad astra».

**Барыс Кіт**
17. 04. 2008